Беларускі Дзяржаўны Універсітэт 1921

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 27 верасня 2001 года, чацвер, № 13 (1842)

**АКТУАЛЬНА**

## СПАРТЫЎНАЕ ЖЫЦЦЁ НЕ СПЫНІЦЬ

З новага навучальнага года заняткі па фізвыхаванні ў спарткомплексе БДУ на вуліцы Кастрычніцкай не праходзяць. Будынак у аварыйным стане, і сёння амаль усё там патрабуе рамонту і рэстаўрацыі.

Дзе ж зараз праводзяцца заняткі? Ці зможа Белдзяржуніверсітэт добра арганізаваць спартыўнае жыццё студэнтаў і выкладчыкаў? Па словах Сяргея Уладзіміравіча Макарэвіча, загадчыка кафедры фізвыхавання, шмат для гэтага ўжо зроблена: дасягнуты дамоўленасці са шматлікімі арганізацыямі, якія прадставяць стадыёны, спартзалы, а таксама час, у які студэнты маглі б імі карыстацца. Згоду далі ўжо алімпійскі спарткомплекс ("Працоўныя рэзервы"), Палац культуры і спорту чыгуначнікаў, БДЭУ. Не трэба забываць і пра ўласныя залы універсітэта, якія размешчаны на некалькіх факультэтах. Адна з іх — спартзала філфака. Але ўжо з пачатку навучальнага года яна прымае надта вялікую колькасць студэнтаў. Заняткі даводзіцца праводзіць на вуліцы, у парку імя М. Горкага. Добра яшчэ, што надвор'е спрыяе.

Захаваюцца і секцыі — як агульнауніверсітэцкія, так і факультэцкія. Для іх выдзелены асобны час і месца. Больш падрабязную інфармацыю пра секцыі выкладчыкі фізвыхавання дадуць у канцы верасня ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ.

Што датычыцца спарткомплексу на вуліцы Кастрычніцкай, дык вярнуцца ў яго студэнты змогуць толькі праз два гады.

*Андрэй ДЗЯРКАЧ, студэнт журфака*

**АБ'ЯВЫ**

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: арганічнай хіміі і хіміі высокамалекулярных злучэнняў, агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі, славянскіх літаратур, замежнай літаратуры, сучаснай беларускай мовы;

**ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ** неарганічнай хіміі;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: ядзернай фізікі, тэарэтычнай фізікі, аналітычнай хіміі, рускай літаратуры, замежнай літаратуры, літаратурна-мастацкай крытыкі, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтва, гісторыі Расіі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: тэарэтычнай фізікі, агульнай фізікі, фізічнага выхавання і спорту;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, тэхналогій камунікацыі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: ядзернай фізікі, фізікі цвёрдага цела, радыёфізікі, эканамічнай геаграфіі замежных краін.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*
*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ВЫСТАВЫ**

## Фундаментальная бібліятэка Белдзяржуніверсітэта

*з задавальненнем запрашае наведаць кніжныя выставы і тэматычныя прагляды, падрыхтаваныя супрацоўнікамі бібліятэкі. Выставы працуюць на працягу двух тыдняў пасля адкрыцця.*

**21 верасня** — выстава «Падарожнік у часе», прымеркаваная да 135-годдзя з дня нараджэння Г. Уэлса, на абанеменце бібліятэкі філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**24 верасня** — выстава «Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі» ў чытальнай зале бібліятэкі хімічнага факультэта (вул. Ленінградская, 14).

**27 верасня** — выстава навуковых працаў першага прафесара геаграфіі ў Беларусі А.А. Смоліча, прымеркаваная да 110-годдзя з дня нараджэння, у студэнцкай чытальнай зале прыродазнаўчых навук № 4 (прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус, трэці паверх).

**28 верасня** — выстава «Этыка дзелавых адносін» у чытальнай зале бібліятэкі факультэта міжнародных адносін (вул. Акадэмічная, 25).

**30 верасня** — выстава «Люблю цябе, жыццё, любоўю кроўнай», прымеркаваная да 70-годдзя з дня нараджэння Н. Гілевіча, на абанеменце бібліятэкі філалагічнага факультэта (вул. К. Маркса, 31).

**ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?**

## РАССЯЛІЛІСЯ

Засяленне ў інтэрнат — працаёмісты працэс. Хаця студэнты засяляюцца толькі ў канцы жніўня, адміністрацыя студгарадка рыхтуецца загадзя. І сёлетні год не выключэнне. У чэрвені 2001 года быў зацверджаны загад рэктара пра размеркаванне месцаў у інтэрнатах, узгоднены з дэканамі ўсіх факультэтаў і кіраўнікамі структурных падраздзяленняў БДУ.

Само засяленне праходзіла дастаткова арганізавана. Загадзя быў складзены графік, паводле якога кожнаму курсу быў прызначаны пэўны дзень для засялення ў інтэрнат. Нягледзячы на тое, што не ва ўсіх атрымлівалася з'явіцца ў прызначаны час, ужо да 1 верасня было заселена больш за 80 % студэнтаў. Атрымалі жыллё амаль усе жадаючыя. І хаця недахоп месцаў — гэта адна з галоўных праблемаў, з якімі сутыкаецца студэнцкі гарадок БДУ, але наша ВНУ — адна з нямногіх, дзе практычна ўсе іншагароднія студэнты атрымліваюць месцы ў інтэрнатах. Недахоп жа месцаў выкліканы шэрагам прычынаў, адна з якіх — капітальны рамонт інтэрнатаў (сёлета, напрыклад, на рамонт зачыніўся інтэрнат № 2, а студэнтаў, якія пражывалі там, рассялілі па іншых інтэрнатах).

*Інфармацыйная служба студгарадка БДУ*

# ГАЛОЎНАЕ — РУСКАЯ МОВА. ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ

*Сёлета спаўняецца 30 гадоў з часу заснавання кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай. Кафедра незвычайная. Працуе яна з іншаземцамі, якія ўжо прайшлі курсы на падрыхтоўчым факультэце і сталі паўнапраўнымі студэнтамі нашага універсітэта. Падрабязней пра кафедру расказаў яе загадчык, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Сяргей Іванавіч Лебядзінскі.*

*— Сяргей Іванавіч, якое, на Ваш погляд, самае галоўнае дасягненне кафедры за 30 гадоў яе існавання?*

— Шмат што за 30 гадоў зроблена, шмат вопыту набыта. Але самае галоўнае, я лічу, што нам удалося гэты вопыт захаваць. У цяжкія часы, калі было скарачэнне кадраў і ў іншых ВНУ, і на нашай кафедры, калі стала менш прыязджаць іншаземцаў, мы стабілізавалі сітуацыю і не адмовіліся ад дасягнутага. Мы захавалі і кафедру, і наш патэнцыял выкладчыцкага саставу.

*— Як змянілася кафедра за апошнія гады?*

— Раней наша кафедра была агульнауніверсітэцкай. Але ў мінулым годзе мы ўвайшлі ў склад факультэта міжнародных адносін. Аднак гэта не значыць, што мы працуем толькі з ФМА. Мы працуем з усімі факультэтамі.

Зараз на кафедры 16 чалавек, 13 з якіх — выкладчыкі. Абслугоўваем мы каля 200 навучэнцаў.

*— Ці цяжка працаваць з замежнымі студэнтамі?*

— Даволі цяжка. Справа ў тым, што, як правіла, даводзіцца выкарыстоўваць мову, якая магла б быць пасрэднікам (англійскую, іспанскую, французскую і г.д.). Паводле методыкі, не пажадана яе выкарыстоўваць. І зразумела, чаму. Але яна займае 50 % часу, адведзенага на заняткі.

Вы ведаеце, што ў нас зараз вучыцца пераважна кітайскі кантынгент. Хоць і кажуць, што логіка ва ўсіх людзей аднолькавая, але атрымліваецца, што ў кітайцаў яна выяўляецца фармальна зусім паіншаму. Таму, не ведаючы мовы, не ведаючы нацыянальнай спецыфікі псіхалогіі тых жа кітайцаў, даводзіцца навучаць іх на інтуіцыйным узроўні.

Цяжкасць яшчэ і ў тым, што замежным студэнтам удзяляецца мала ўвагі. Сёння страчана вельмі добрая сістэма з сацыялістычных часоў, калі была каардынацыя іншаземцаў. Іх праблемамі займалася не толькі кафедра, але і іншыя ўстановы (гарвыканкам, напрыклад). Зараз жа, акрамя кафедры і дэканатаў, іншаземцамі ніхто не цікавіцца.





*— У нас навучаюцца студэнты з самых розных краін. Як фарміруюцца групы — па нацыянальнасці ці па ўзроўні валодання мовай?*

— Гэта таксама можна аднесці да праблемы. Канешне, у нас ёсць спецпраграмы, тэсты, якія дапамагаюць фарміраваць групы. І галоўны крытэрый — валоданне мовай. Але не ўсё так проста. Справа ў тым, што на некаторыя факультэты (мехмат, хімфак) даюць месцы невялікай колькасці іншаземцаў, таму мы іх аб'ядноўваем з замежнымі студэнтамі іншых факультатаў.

*— Ці ёсць у вас вопыт узаемадзеяння з якімі-небудзь арганізацыямі, іншымі ВНУ?*

— Яшчэ ў савецкія часы пачала функцыяніраваць такая арганізацыя, як МАПРЯЛ (Міжнародная асацыяцыя выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры). Яна створана на базе ЮНЕСКА. Штаб-кватэра яе знаходзіцца ў Парыжы. І зараз мы ўзаемадзейнічаем з гэтай арганізацыяй і з іншымі ВНУ. У траўні ў нас праходзіў міжнародны кангрэс, і там прадстаўнікі з Масквы прапанавалі зрабіць беларускую рэгіянальную асацыяцыю па рабоце з замежнымі студэнтамі. Маецца на ўвазе аб'яднанне ўсіх кафедраў, аналагічных нашай. Мы ўжо распрацавалі статут, праграму на 5 гадоў. Трэба яшчэ абраць прэзідэнта, віцэ-прэзідэнта, размеркаваць, хто і за што будзе адказваць.

*— Якія мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею кафедры, вы плануеце правесці? Калі ўсё гэта адбудзецца?*

— Праграму свята мы перанясем на канец лістапада ці нават на снежань. У нас адбудзецца выстава публікацый, фотаздымкаў нашых выпускнікоў, якія занялі высокія пасады ў сваіх краінах, з якімі мы падтрымліваем сувязі. Гэта азнаямляльная частка. Таксама пройдзе семінар-канферэнцыя, пасля якой будзе выдадзены зборнік дакладаў удзельнікаў канферэнцыі. Затым мы арганізуем вечарыну, куды ўжо запрошаны ветэраны, заснавальнікі кафедры.

*Андрэй ДЗЯРКАЧ, студэнт журфака*

# Чатыры зоркі на балконе



Студэнцкі «Тэатр на балконе» пры БДУ на пачатку верасня вярнуўся з фестывалю мастацтваў, які кожны год праходзіць у горадзе Эдынбург (Шатландыя) і працягваецца тры тыдні.

Сёлета 42 краіны свету бралі ўдзел у гэтым фестывалі, больш за 1500 спектакляў пабачылі жыхары і госці Эдынбурга ў фестывальныя тыдні.

«Тэатр на балконе» прывёз у Эдынбург п'есу Оскара Уайльда «Як важна быць сур'ёзным». Спектакль быў па-руску, і спачатку было страшна, што гледачы не зразумеюць акцёраў. Аднак поўная зала развеяла ўсе сумненні і страхі. Людзі разумелі ўсё, што адбывалася на сцэне, смяяліся і апладзіравалі. Усяго наш тэатр сыграў 7 спектакляў, і артысты заўважылі такую цікавую акалічнасць: жыхары Эдынбурга ніколі не пойдуць на спектакль, пакуль водгук на яго не з'явіцца ў прэсе. Менавіта таму ў першы дзень у зале было 6 чалавек, на другі — 8, а на трэці дзень (пасля выхаду артыкула ў газеце) прыйшла поўная зала.

Тэатр БДУ атрымаў адзін з найвышэйшых прызоў фестывалю — «4 зоркі». Як сказаў мастацкі кіраўнік тэатра Сяргей Мікалаевіч Турбан, гэты прыз — вельмі добрая падзяка за працу «Тэатра на балконе». Самым лепшым лічыцца прыз «5 зорак», але ён даецца толькі ўжо сталым прафесійным калектывам. Спадзяюся, што нашаму тэатру засталося зусім нямнога да атрымання гэтай узнагароды.

А яшчэ тэатр БДУ быў адзначаны прызам ад газеты «Геральд», якая асвятляла падзеі фестывалю.

...Эдынбургскае свята засталося ў мінулым, і «Тэатр на балконе» рыхтуецца да адкрыцця чацвёртага тэатральнага сезона, якое адбудзецца 5 кастрычніка ў галоўным корпусе БДУ (5 паверх). Той, хто прыйдзе на спектакль у гэты дзень, зможа яшчэ і паглядзець невялікую выставу тэатра, дзе знойдзе амаль усё, што датычыць не толькі самога тэатра, але і фестывалю ў Эдынбургу.

*Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА*

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# ФЕСТЫВАЛЬ НА ЎВЕСЬ ГОД

Пачатак новага навучальнага года прынёс з сабой немінучыя змены ў жыцці студэнцкага гарадка. І ў немалой ступені гэтыя змены закрануць культурнае жыццё студгарадка. Сёлета яго адміністрацыя прыняла рашэнне пра арганізацыю і правядзенне фестывалю студэнцкай творчасці. Мэта гэтага мерапрыемства — знайсці і падтрымаць маладыя таленты, а таксама аб'яднаць усе культурна-масавыя мерапрыемствы, якія праводзяцца ў студгарадку. Фестываль будзе цягнуцца ўвесь год, і прыняць удзел у ім змогуць усе інтэрнаты, творчыя калектывы студгарадка, а таксама запрошаныя госці фестывалю.

З гэтага года ў студгарадку будзе праводзіцца «капуснік», прымеркаваны да самага ўлюбёнага студэнцкага свята — Дня студэнта. У «капусніку» прымуць удзел па адной камандзе ад кожнага інтэрната.

У снежні пройдзе фестываль-конкурс студэнцкай песні «Срэбраныя струны». Гэты фестываль атрымаў вялікую папулярнасць сярод студэнтаў, і менавіта дзякуючы яму на базе інтэрната № 6 сёлета адкрыўся клуб студэнцкай песні, які чакае ўсіх аматараў гітары.

Новы год студэнты сустрэнуць касцюміраваным балем-маскарадам, на якім яны змогуць паўдзельнічаць у конкурсе Дзядоў Марозаў і Снягурак.

На Дзень святога Валянціна арганізатары фестывалю плануюць правесці шоу-конкурс «Каханне з першага позірку», у якім змогуць прыняць удзел усе жадаючыя.

Дарэчы, люты будзе адзначаны і яшчэ адным святам: да 23 лютага студгарадок рыхтуе конкурс «Супермен», які будзе праводзіцца ў два этапы. Першы тур (адборачны) пройдзе ў кожным інтэрнаце, а другі (фінальны) — у студгарадку.

Не менш за шоу-конкурс «Супермен» любяць студэнты і шоу-конкурс «Міс Вясна». Любяць яго не толькі студэнты, але і спонсары: касметычны салон «Маленькі дом», салон-цырульня «Валянціна», стаматалагічны кабінет «Jonathan», рэстаран «Шынок у Лявона», прафкам студэнтаў, Апякунскі савет студгарадка. Яны заўсёды прадастаўляюць цудоўныя падарункі.

У красавіку пройдзе фестываль эстрадных мініяцюраў і музычных пародыяў, прымеркаваны да Дня смеху.

Нарэшце, урачыстым закрыццём фестывалю студэнцкай творчасці стане баль выпускнікоў, які адбудзецца ў канцы мая.

*Кацярына ЛОБАЧ,*
*студэнтка III курса*
*факультэта журналістыкі*

РОЗГАЛАС

# БОЯЗЬ СНІДУ ГОРШ ЗА РАСІЗМ

Барацьба з ганьбай і дыскрымінацыяй у дачыненні да хворых на СНІД ёсць найважнейшай задачай у змаганні з гэтай эпідэміяй, лічаць прадстаўнікі Аб'яднанай праграмы ААН па СНІД (ЮНЭЙДС).

«Ганьба і дыскрымінацыя ў дачыненні да хворых на СНІД застаюцца сур'ёзным бар'ерам на шляху арганізацыі эфектыўнай барацьбы з самай разбуральнай эпідэміяй, з якой калі-небудзь сутыкалася чалавецтва, — заявіў выканаўчы дырэктар ЮНЭЙДС доктар Пітэр Піёт. — У выпадку, калі не ўдасца дамагчыся поспеху ў змаганні з ганьбай і дыскрымінацыяй у дачыненні да хворых на СНІД, гэтая эпідэмія прывядзе ў XXI стагоддзі да такіх разбуральных наступстваў, да якіх прывёў расізм у XX стагоддзі».

Па звестках ЮНЭЙДС, страх перад дыскрымінацыяй можа прыводзіць да адмовы хворых ад праходжання імі курсу лячэння ці да нежадання заявіць публічна пра сваю хваробу. У многіх краінах людзі, хворыя на СНІД ці магчыма інфіцыраваныя ВІЧ, могуць быць пазбаўленыя магчымасці звярнуцца па медыцынскую дапамогу. Яны сутыкаюцца з адмовамі ў працаўладкаванні, набыцці жылля, страхаванні, наведванні іншых краінаў, а таксама іх ігнаруюць сябры і калегі. У шэрагу выпадкаў іх выганяюць з сям'яў, яны зазнаюць фізічнае насілле, іх нават забіваюць.

Па звестках ЮНЭЙДС, на канец 2000 года ў свеце налічвалася 36,1 мільёна ВІЧ-інфіцыраваных людзей і 3 мільёны чалавек ужо загінулі ў выніку хваробаў, звязаных са СНІДам.

*Па матэрыялах*
*прадстаўніцтва ААН у Беларусі*

**УСПАМІН ПРА ЛЕТА**

# *Прыз – фантаны Пецяргофа*



*Лета – найлепшая пара для адпачынку, пагатоў заслужанага. А заслужыць яго – лёгка: трэба толькі ўдзельнічаць у конкурсах нашага студгарадка і, вядома, выйграваць.*

*Напрыклад, для Асі Марчанка гэтае лета стала незабыўным менавіта дзякуючы перамозе на конкурсе студэнцкага гарадка «Міс Вясна 2001 года». Галоўным прызам гэтага конкурсу была паездка на тры дні ў Санкт-Пецярбург, прадастаўленая грамадскім аб'яднаннем «Апякунскі савет студэнцкага гарадка Белдзяржуніверсітэта».*

— Падарунак прыйшоўся мне даспадобы. Вядома, тры дні — гэта вельмі мала, але нават за такі кароткі час я ўбачыла шмат цікавага. У першы дзень нам наладзілі экскурсію па горадзе, мы наведалі Эрмітаж з яго цудоўнай калекцыяй твораў мастацтва, пабачылі славуты крэйсер «Аўрора». Вельмі спадабалася ў Пецяргофе. Я ж нездарма абрала для паездкі самы разгар лета, калі Пецяргоф — гэта проста казка. Велізарная колькасць фантанаў, якія працуюць адначасова, пырскі вады, падобныя да россыпу каштоўных камянёў, — усё гэта зачароўвае і захапляе. Аднак больш за ўсё запомнілася паездка на кацеры па піцерскіх рэках і каналах. Тым больш, што менавіта з кацера найлепш відаць архітэктуру горада, дасканаласці якой не перастаеш здзіўляцца. Адзінае, чаго яшчэ хацелася б, — надаць больш увагі не гістарычнаму, а культурнаму жыццю Санкт-Пецярбурга. Дарэчы, я не забылася кінуць манетку ў адзін з фантанаў Пецяргофа, таму спадзяюся абавязкова вярнуцца туды.

*Інфармацыйная служба студгарадка БДУ*

**РЭПАРТАЖ З КОЛАЎ**

# 47 – ЗАЧАРАВАНАЯ ЛІЧБА

Гэты маршрут знаёмы ўсім, хто жыве ў інтэрнатах № 3 і № 10. Напрыканцы мінулага навучальнага года сітуацыя з ім была хоць і далёкай ад ідэалу, але ўсё ж больш-менш адпавядала патрэбам студэнтаў. Аднак з пачаткам гэтага навучальнага года ўсе расклады знялі, а сам аўтобус стаў хадзіць проста непрадказальна. Акрамя таго, з-за рэканструкцыі Мінскай кальцавой аўтадарогі (МКАД) аўтобус вымушаны рабіць вялікі круг, у выніку чаго час паездкі павялічыўся на 5-7 хвілін. І ўсё-ткі 47-ы маршрут усё яшчэ з'яўляецца самым зручным для студэнтаў транспартным сродкам.

Але 6 верасня маршрут пераўзышоў самога сябе. Пасля таго, як у Шчамысліцы не было двух папярэдніх рэйсаў, аўтобус на 7.39 не змог змясціць усіх жадаючых дабрацца да месца вучобы. Тых, хто ехаў у неверагоднай штурханіне, радавала ўжо толькі тое, што яны едуць. Але радасць была нядоўгай. Нешта ў «Ікарусе» стрэліла, вадзіцель агледзеў сваю машыну і загадкава пасміхнуўся. Пасля гэтага аўтобус праехаў яшчэ метраў 20 і спыніўся канчаткова, акурат пасярэдзіне моста.

Студэнты з жалем пакінулі транспартны сродак і заняліся пераадоленнем перашкод. Па-першае, трэба было перабегчы паласу МКАД з вельмі інтэнсіўным рухам, а пасля гэтага на шляху паўставала металічная агароджа перад паласой з сустрэчным рухам. Найбольшыя цяжкасці выпалі на долю прыгожых прадстаўніц студэнцтва: па-першае, яны маюць меншы, чым хлопцы, вопыт лазання па ўсялякіх платах і дрэвах, а па-другое, значная частка дзяўчат носіць спадніцы, што стварае дадатковую складанасць. Потым зноў была штурханіна ўжо ў 45-м аўтобусе, перасадка на Маскоўскай, прабежка да будынка факультэта... У выніку тыя, хто дабраўся да вучобы, прыбылі на першую лекцыю са спазненнем на 10—15 хвілін...

На наступны дзень быў выпадак, калі са Шчамысліцы амаль адначасова (з інтэрвалам у 5 хвілін) паехалі адразу два аўтобусы. Аднак ёсць надзея, што гэта былі апошнія «фокусы» 47-га аўтобуса. З 10 верасня дыспетчарскай станцыяй «Дружная» прыняты новы расклад руху, згодна з якім па буднях на маршрут будуць выходзіць чатыры аўтобусы, у суботу — 3, у нядзелю — 2.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ*

## РАСКЛАД АЎТОБУСНАГА МАРШРУТУ № 47 (БУДНІ)

| *Пл. Незалежнасці* | *Філіял БДУ* |
|---|---|
| 5.57, 6.16, 6.35, 6.54, 7.13, 7.32, 7.51, 8.10, 8.29, 8.48, 9.10, 9.34, 10.04, 10.34, 11.04, 11.29, 11.54, 12.20, 12.45, 13.10, 13.36, 14.01, 14.21, 15.03, 15.29, 15.54, 16.10, 16.45, 17.10, 17.35, 18.01, 18.31, 19.13, 19.46, 20.22, 20.58, 21.23, 21.48, 22.13, 22.39, 23.02, 23.27, 23.53, 0.15 | 6.34, 6.53, 7.12, 7.31, 7.50, 8.09, 8.28, 8.47, 9.06, 9.25, 9.47, 10.11, 10.41, 11.11, 11.41, 12.06, 12.31, 12.57, 13.22, 13.47, 14.13, 14.38, 15.09, 15.40, 16.06, 16.31, 16.56, 17.22, 17.47, 18.12, 18.38, 19.08, 19.50, 20.23, 20.54, 21.35, 22.00, 22.25, 22.50, 23.16, 23.39, 0.04, 0.30, 0.52 |

## РАСКЛАД АЎТОБУСНАГА МАРШРУТУ № 47 (СУБОТА)

| *Пл. Незалежнасці* | *Філіял БДУ* |
|---|---|
| 5.57, 6.22, 6.48, 7.13, 7.38, 8.04, 8.29, 8.54, 9.30, 10.08, 10.46, 11.24, 12.02, 12.40, 13.18, 13.56, 14.29, 14.41, 15.26, 16.04, 16.42, 17.20, 17.58, 18.40, 19.49, 20.31, 21.09, 21.47, 22.25, 23.03, 23.41, 0.15 | 6.34, 6.59, 7.25, 7.50, 8.15, 8.41, 9.06, 9.31, 10.07, 10.45, 11.23, 12.01, 12.39, 13.17, 13.53, 14.33, 15.18, 16.03, 16.41, 17.19, 17.57, 18.35, 19.17, 20.26, 21.08, 21.46, 22.24, 23.02, 23.40, 0.18, 0.52 |

## РАСКЛАД АЎТОБУСНАГА МАРШРУТУ № 47 (НЯДЗЕЛЯ)

| *Пл. Незалежнасці* | *Філіял БДУ* |
|---|---|
| 6.00, 6.38, 7.16, 7.54, 8.32, 9.20, 10.30, 11.12, 11.50, 12.28, 13.06, 13.44, 14.33, 15.11, 15.49, 16.27, 17.05, 17.34, 19.00, 19.38, 20.16, 20.54, 21.32, 22.10 | 6.37, 7.15, 7.53, 8.31, 9.09, 9.57, 11.07, 11.49, 12.27, 13.05, 13.43, 14.21, 15.10, 15.48, 16.26, 17.04, 17.42, 18.20, 19.37, 20.15, 20.53, 21.31, 22.09, 22.47 |

# СТВАРАЛЬНІК НОВЫХ ФАКУЛЬТЭТАЎ

## Рэктар БДУ Ананій Іванавіч Дзякаў



Амаль усе рэктары Белдзяржуніверсітэта даваеннага часу — за выключэннем У.І. Пічэты — былі выхадцамі з асяроддзя сярэдняга беларускага сялянства. Не быў выключэннем з іх і Ананій Іванавіч Дзякаў.

Ён нарадзіўся 1 кастрычніка 1896 года ў вёсцы Баранаўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні (зараз Хіславіцкі раён Смаленскай вобласці Расійскай Федэрацыі). Юнак скончыў валасную школу. Верагодна, паступіў у Мсціслаўскае павятовае вучылішча.

Аднак у 1915 годзе яго лёс змяніўся: Ананій Дзякаў пайшоў у імператарскае войска. За мужнасць, выказаную ў баях, ён хутка стаў прапаршчыкам, а затым і афіцэрам. Але ў 1917 годзе пакінуў царскае войска і стаў на бок савецкай улады. У 1918 годзе яго прымаюць у камуністычную партыю. У 1919-1923 гадах яго лёс быў звязаны з Чырвонай арміяй, дзе Ананій Іванавіч камандаваў ротай.

Потым была праца намеснікам старшыні Мсціслаўскага павятовага выканкама. А ў 1924 годзе Ананія Іванавіча прызначылі намеснікам старшыні Магілёўскага акруговага выканкама. Працуючы намеснікам, а потым і старшынёй губвыканкама, А.І. Дзякаў вялікую ўвагу надаваў сельскай гаспадарцы і народнай адукацыі. Асноўным яго клопатам было ажыццяўленне «хутарызацыі» — зямельнай рэформы беларускай вёскі, вынікам чаго стала павелічэнне слою вясковых «сераднякоў».

Кіраваў ён і нацыянальнай камісіяй у Магілёве, якая займалася пытаннямі беларусізацыі акругі. Характэрнай рысай яго працы стала патрабаванне да ўсіх службоўцаў дзяржаўнага апарату ведаць беларускую мову.

У 1928 годзе Дзякава накіравалі на навучанне ў Прамысловую акадэмію ў Маскве, але навучацца яму не давялося. У верасні таго ж года па выкліку старшыні СНК БССР М.М. Галадзеда ён вярнуўся ў Мінск: кандыдатура Дзякава была прапанаваная на пасаду Пастаяннага прадстаўніка БССР пры ўрадзе СССР у Маскве. Праўда, нешта не атрымалася з гэтым прызначэннем, і тады А.І. Дзякава накіравалі на працу ў Віцебск — намеснікам, а потым і старшынёй акрвыканкама. Тут ён таксама займаўся «хутарызацыяй» і нават атрымаў ухвальны водгук ад М.М. Галадзеда. Але ўсё гэта ўжо не мела вялікага значэння — у краіне пачалася калектывізацыя, і АДПУ ўжо рыхтавала справу «Саюза вызвалення Беларусі»...

Верагодна, менавіта гэтыя падзеі змусілі А.І. Дзякава пакінуць пасаду старшыні Віцебскага акрвыканкама. У 1930 годзе ён паступіў вучыцца ў Інстытут чырвонай прафесуры савецкага будаўніцтва і права ў Маскве, дзе і навучаўся да лютага 1934 года.

Вярнуўшыся ў Мінск, Ананій Іванавіч атрымаў прапанову ўзначаліць Белдзяржуніверсітэт. Так, напрыканцы лютага 1934 года замест выконваючага абавязкі рэктара В.К. Раманоўскага БДУ атрымаў новага рэктара — А.І. Дзякава, які з 1 сакавіка дадаткова яшчэ ўзначаліў агульнауніверсітэцкую кафедру грамадскіх навук.

На гэты час у БДУ былі тры асноўныя факультэты: хімічны, фізіка-матэматычны і біялагічны. Дзейнічалі таксама рабочы факультэт і вячэрняе аддзяленне з асобнымі польскай і яўрэйскай секцыямі. Па звестках на 1 ліпеня 1934 года, ва універсітэце было 525 студэнтаў, на вячэрнім аддзяленні навучалася 108 студэнтаў. Працавалі харавы, музычны і фізкультурны гурткі. Студэнтам рабіліся скідкі на квіткі ў кіно (40 %), у тэатр (50 %). 75 % студэнтаў атрымлівалі стыпендыю ў памеры 70-80 рублёў на І курсе і да 130 рублёў на IV курсе (у залежнасці ад паспяховасці). Пры БДУ працавала сталовая, кошт абеду ў якой складаў 70 капеек. Новы рэктар прыняў меры, каб заахвоціць студэнтаў да выдатнага навучання: 3 сакавіка 1934 года былі зацверджаны тры персанальныя стыпендыі студэнтам (па 300 рублёў).

Горш было з інтэрнатамі: Мінскі гарсавет то прадастаўляў будынкі, то зноў адбіраў іх, а часцей за ўсё яны былі проста непрымальныя для нармальнага пражывання. З-за недахопу плошчы пад студэнцкі інтэрнат давялося нават перадаць фізкультурную залу універсітэта. Кепска было і з памяшканнямі пад аўдыторыі...

Быў у новага рэктара і яшчэ адзін важны клопат — пашырэнне універсітэта. У 1934 годзе ў БДУ з'явіліся два новыя факультэты: гістарычны і геолага-глебава-геаграфічны, — а таксама шэраг новых кафедраў (грамадскай гісторыі, глебазнаўства, замежных моваў, фізіялогіі і анатоміі раслін і г.д.).

А.І. Дзякаў выявіў сябе ў такіх складаных умовах выдатным адміністратарам. Для новых факультэтаў ён дабіўся атрымання кніг (25 тыс. тамоў) з Ленінградскай кніжнай палаты. Дзеля таго каб забяспечыць гэтыя факультэты выкладчыцкімі кадрамі, было арганізавана навучанне аспірантаў.

Самай значнай падзеяй у навуковым жыцці таго часу сталі дзве Усебеларускія канферэнцыі: фізіка-матэматычная (8-9 студзеня 1934 года) і гістарычная (8 студзеня 1935 года). Канферэнцыі гэтыя БДУ арганізаваў разам з Акадэміяй навук, запрасіўшы на іх навукоўцаў не толькі з Беларусі, але і з Украіны і Расіі.

Рэктар напружана працаваў. Апроч сваіх асноўных абавязкаў кіраўніка універсітэта, ён яшчэ ўзначальваў кафедру ленінізму, кіраваў семінарам прапагандыстаў, быў членам парткама і г.д. Не пакідаў па-за ўвагай Ананій Іванавіч і праблему беларускасці ў БДУ. Хаця афіцыйная беларусізацыя ўжо даўно была спыненая і навокал лаялі «правакатараў беларускіх нацыянал-дэмакратаў», рэктар дамагаўся, каб усе студэнты ведалі беларускую мову. Дарэчы, сам ён карыстаўся беларускай мовай і ўсе загады выдаваў толькі па-беларуску.

Значнай падзеяй у жыцці універсітэта стала выданне газеты. Ранейшы «Голас рабфакаўца» перастаў выходзіць яшчэ ў 1931 годзе. І вось 1 мая 1935 года выйшаў першы нумар газеты «За ленінскія кадры» (з 1948 года — «За сталінскія кадры», з 1955 года — «Беларускі універсітэт»).

У верасні 1935 года А.І. Дзякава перавялі на працу ў апарат ЦК КП(б)Б на пасаду загадчыка аддзела культуры і асветніцкай работы. Але і на новым месцы ён не парываў сувязі з БДУ: па-ранейшаму ўзначальваў кафедру ленінізму. Па яго прапанове да 15-гадовага юбілею універсітэта было вырашана выпусціць кнігу «Гісторыя БДУ».

У красавіку 1936 года Ананій Іванавіч быў прызначаны наркамам асветы Беларусі. А на наступны дзень пастановай Прэзідыума ЦВК быў створаны ўрадавы камітэт, узначалены А.І. Дзякавым, па святкаванні 15-годдзя БДУ.

У маі 1937 года наркама асветы арыштавалі як аднаго з «кіраўнікоў» прыдуманай НКУС «нацыянал-фашысцкай арганізацыі». Пасля допытаў і бесчалавечных катаванняў А.І. Дзякаў прызнаўся ва ўсіх прад'яўленых яму абвінавачаннях. 28 кастрычніка таго ж года на закрытым судовым пасяджэнні (якое доўжылася ўсяго 15 хвілінаў) яго прысудзілі да вышэйшай меры пакарання. На наступны дзень Ананія Іванавіча расстралялі разам з былым рэктарам Белдзяржуніверсітэта Я.П. Каранеўскім, выконваючым абавязкі рэктара А.С. Кучынскім і многімі іншымі.

Справа А.І. Дзякава была перагледжаная ў 1956 годзе. 2 красавіка 1957 года прысуд быў адменены, а сама справа — спынена за адсутнасцю складу злачынства.

*А.А. ЯНОЎСКІ,*
*кандыдат гістарычных навук,*
*прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце,*
*А.Г. ЗЕЛЬСКІ,*
*загадчык Музея гісторыі БДУ*

# СЛЯЗУ ЛЮБОВІ ДАРУЮ ВАМ:

## Брусель, Берлін, Парыж і Дрэздэн, Антверпен, Амстэрдам

## *Introductio*

Сёлетнім спякотным летам я зрабіў для сябе надзвычайнае адкрыццё. Варта было праехаць паў-Еўропы, каб у Брусэлі, у саборы святога Міхаіла ўбачыць незвычайную драўляную кампазіцыю на сюжэт выгнання з раю. Мяне даўно цікавіла гэтая біблейская гісторыя, а вось мастацкага яе ўвасаблення, апроч, бадай, цытаты з Бібліі, знойдзецца не шмат. Сапраўды, як ішло яно, выгнанне з раю?

Можам прыгадаць аж некалькі карцін мастака П.П. Рубенса з калекцыі ў Антверпене на матыў пакут Хрыста на Галгофе: «Зняцце з крыжа», «Ускладанне на крыж», «Уваскрашэнне Хрыста». Але няма выяў «выгнання з раю»... А як сёння адбываецца ў людзей пазбаўленне «зямнога раю»?

Чым даўжэй і ўважлівей мы глядзім на выдатную чорную драўляную кафедру «Выгнанне з раю», тым больш пераконваемся, што нешта падобнае ўжо бачылі, сустракаліся з такімі чорнымі разнымі фігурамі, што такое адчуванне мы перажывалі ўжо, але вось да канца выказаць не маглі.

Так заўсёды здараецца, калі сустракаешся з сапраўдным мастацтвам. Вось менавіта таму дзеля аднаго такога адкрыцця ў адзін з прыгожых жнівеньскіх дзён мы з жонкай Людмілай Арсеньеўнай — загадчыцай сектара навукова-даследчай часткі БДУ, селі ў турыстычны аўтобус і на два тыдні адправіліся ў свет у пошуках «зямнога раю»...

## *Брусель: момант ісціны*

Ёсць нейкая знамянальнасць для чалавека і чалавецтва ў тым, што сабор носіць імя святога Міхаіла.

На скульптурнай кампазіцыі «Выгнанне з раю» з чорнага дрэва адлюстраваны Адам і Ева (у адзенні, ужо ў граху), на якіх замахваецца, трымаючы ці то сцяжок, ці то меч у руцэ, разгневаны анёл, а над фігуркамі саміх людзей ужо навісла ў выглядзе чалавечага шкілета смерць: яны, гэтыя двое, ужо смяротныя. А зверху ўзнеслася ў райскім святле і арэоле Святая Дзева з крыжам у руках і німбам над галавой ў недасягальнай вышыні ідэалу.

«Сабор святога Міхаіла і святой Гудулы» — энцыклапедыя архітэктурнага мастацтва, ён увасабляе сабою веліч, магутнасць, росквіт Сярэднявечча. Першы камень тут заклаў яшчэ ў 1226 годзе герцаг Брабанцкі. Векавая гісторыя царквы, якую мы, бадай, не ведаем, увасабляецца ў сюжэтах і малюнках; тут пераплятаюцца стылі розных эпох: раманскага, гатычнага, рэнесансу.

Ах, ветраная Бельгія! Не з'ездзілі б мы ў Еўропу, не ўбачылі б «Сабора святых Міхаіла і Гудулы», можа, тады б мы і не задумваліся над усім гэтым «зямным» і «незямным раем», жылі б, як жылі, не зрабілі б для сябе душэўнага адкрыцця: трэба цаніць «рай» у саміх сабе, берагчы сваю душу, сваю адметнасць, непаўторнасць.

Што ж, у дарогу! На калёсы!

Брусель, «Брукселе» («горад на балотах»), быў заснаваны ў 580 годзе на невялічкім астраўку на рацэ Сенне. Доўгі час Брусель разам з Гаагай быў рэзідэнцыяй каралёў Нідэрландаў. Незалежнасць бельгійцы атрымалі ў выніку змагання на барыкадах у ноч з 24 на 25 жніўня 1831 года. Цяпер правіць Бельгіяй кароль Альберт II. У Брусэлі пражывае 2,5 млн. чалавек, усяго ў Бельгіі — 10 млн. жыхароў. У сталіцы ёсць метро, аўтобус, тралейбус, трамвай. Ціхі, утульны гарадок. Прыгожыя living рознакаляровыя дамы, дзе пераважаюць белыя вапняковыя і чырвоныя цагляныя колеры.

Брусель лічыцца сталіцай Фландрыі, Бельгіі і... Еўропы. Горад цэркваў, музеяў, кавярняў, гістарычных дамоў, якія акружаюць самую вялікую тэатральную плошчу ў сэрцы Еўропы. Дый сам Брусель пабудаваны ў форме чалавечага сэрца. Плошча становіцца то дзівосным дываном з кветак, то велізарнай сцэнай, дзе ў канцы кожнага тыдня адбываюцца канцэрты і гучыць класічная музыка. Штодня адкрываецца і закрываецца заслона тэатра жыцця.

Горад размешчаны на сямі ўзгорках, дзеліцца на Верхні і Ніжні. Калісьці наверсе жылі багацеі, а ўнізе размяшчаліся дамы рамеснікаў. Цяпер толькі адну тэатральную плошчу абдымаюць дамы: «Ваўчыца» — гільдзіі лучнікаў, «Ліса» — гандляроў галантарэі, «Ражок» — былы дом лодачнікаў, «Мяшок» — чырванадрэўшчыкаў і бачкароў, на малюнку ў мяшку купца — рука іншага хітруна. Статуі, выявы, сюжэты. «Дом пекараў» — будынак самай уплывовай калісьці гільдыі купцоў у горадзе, дом інакш называны «Кароль Іспаніі». Цяпер разумееце, які бізнес самы прыбытковы? Хлеб наш надзённы...

Ёсць дамы «Лісяня», «Крот», «Паўлін», «Чмель», «Пакойчык Амана», «Залаты капялюшык», «Анёл», «Залатое дрэва», «Дом піваварaў», «Лебедзь» — купецкай гільдзіі мяснікоў.

Домікі «Узгорак», «Алавяны кацялок», «Вятрак», «Эрмітаж», «Адзінокі вясковы домік» злучаныя ў «Дом герцагаў Брабанцкіх». Усе гэтыя дамы належалі дубільшчыкам, цеслярам, млынарам, скульптарам і ломшчыкам шыферу. Група дамоў аб'яднана балюстрадай з вазамі і гарэльефамі, лепкай, якая ўвасабляла Дастатак.

Незвычайнай прыгажосцю сваёй архітэктуры ўражвае «Дом караля», хоць кароль у доме не жыве, бо калісьці тут захоўвалі сваю выпечку пякарні. Зрэшты, чаго там за доўгія гады не было — дом датуецца XIII стагоддзем. Пабудаваны ў гатычным стылі, будынак упрыгожаны характэрнымі кветкістымі скульптурамі. Ажурныя выступы, апсіды, упрыгожаныя пілястрамі, анфілады, калоны, шпілі башняў...

«Зорка» — адзін з самых старадаўніх дамоў гэтай калекцыі. Тут жа знаходзіцца бронзавая статуя героя барацьбы паміж гільдыямі і патрыцыямі Э. Серкласа (XIV ст.). Калі дак-



*«Дом Караля» (XIII ст.). Тут размяшчаецца Камунальны музей Брусэля.*

ранууца да рукі статуі (так сведчыць народная пасляўка), можна чакаць, што збудуцца ўсе жаданні. Вось таму рука ў воіна вышмальцаваная турыстамі да бляску, нібыта да касці. Кажуць, дапамагае.

«Каралеўскі музей мастацтваў», на будынку якога неакласічныя бронзавыя статуі: Жывапіс, Скульптура, Архітэктура, Музыка, — бюсты мастакоў, кампазіцыі "Усхваленне мастацтва" і "Натхненне мастацтва", а ў залах-салонах — палотны П.П. Рубенса, А. Ван Дэйка і інш.

І, вядома, брусельскія карункі і выцінанкі, каўнерыкі, манжэты, хустачкі, абрускі. Цешыць вока, радуе і захапляе шырокая ў акружнасці і высокая карункавая спадніца, як званіца, з брусельскіх узораў самой імператрыцы Яўгеніі. Сапраўдны твор мастацтва!

...Музей "Міні-Еўропа" пад адкрытым небам змяшчае лепшае з архітэктурных забудоў у парку ў маштабе 1:25 на траве, сярод дрэў.

...Помнікі Дон-Кіхоту і Санча Пансу падарыла бельгійцам Іспанія як сімвал вечнага змагання духу і матэрыі, душы і цела.

Бельгія — краіна трохмоўная, што для нас асабліва цікава. Афіцыйна прызнанымі ў краіне з'яўляюцца французская, нідэрландская і нямецкая мовы. Унікальная з'ява — вывучэнне замежных моў стала для бельгійцаў ледзь не спортам, паўсюдным захапленнем: Бельгія ляжыць на перакрыжаванні шляхоў у Еўропу і з Еўропы, таму яе жыхары павінны, мяркую, ведаць шматлікія мовы свету.

Як вядома, у Брусэлі размяшчаюцца «Камісія і Савет Еўрапейскай супольнасці», гэта сталіца «Агульнага рынку» — выстава ўсіх тавараў-люкс. Тут — штаб-кватэра НАТА, Музей армій. Тут амаль усё каралеўскае. Каралеўскія палацы, каралеўскія аранжарэі — ажурныя, са шкла і найтанчэйшых алюмініевых сплаваў, паветрана-празрыстыя, дзе расце ўся экзатычная зеляніна свету. І вітражы. Скульптуры. Храмы. Старасветчына і сучаснасць. Фантаны. Закутая ў бетонную трубу гнілая рэчачка Сенна, схаваная пад зямлёй, як наша Няміга.

Кароль Леапольд II купіў і ўсталяваў у краіне дакладную копію Балонскага фантана ў Італіі, кітайскі павільён, японскую вежу. Леапольд II разводзіў кветкі з усіх палёў свету, з захапленнем палюбіў цяплічкі, сам канструяваў парнічкі, марыў памерці ў аранжарэі, сярод мноства кветак.

Найпрыгажэйшыя цэрквы — «Нацыянальная базіліка Святога Сэрца», «Божая Маці Капліцы», «Божая Маці Саблона» — самая прыгожая: у неагатычным стылі, сапраўдная каменная рачная плынь з выразанымі і аздобленымі шпілямі, башнямі, фрэскамі, гарэльефамі, скульптурамі. Гатычная царква «Божай Маці Саблона» пабудавана ў 1304 годзе. Тут жа Плошча Саблона — арыстакратычны квартал, у цэнтры якога стаіць манументальны фантан з белага мармуру, наверсе фігура Мінервы ў атачэнні анёлаў.

У царкве «Божай Маці Капліцы» назаўсёды знайшлі вечны супачын і царства нябеснае многія выдатныя асобы.

Архітэктура, гісторыя, лёсы народаў і людзей. У царкве «Божай Маці добрых дзеянняў» вянчаліся бельгійскі скрыпач-віртуоз,



*«Халская Брама» (XIV ст.). Зараз тут Каралеўскі музей зброі.*

кампазітар Шарль Берыо, слынны на ўвесь свет і асабліва знакаміты ў XIX стагоддзі, і яго каханая Малібран Гарсія — спявачка, сястра Паліны Віярдо, той, у якую быў закаханы І.С.Тургенеў. Малібран Гарсія памерла на сцэне падчас сваіх спеваў. Яна пахаваная з мужам тут жа. Можа, гэтае апошняе прыстанішча і было сапраўдным іх «зямным раем»? Сплячэнне рук, суладдзе душ, перапляценне лёсаў... Як усё-такі ўсё ў нас узаемазвязана. Дзе Бельгія і дзе той «Бежын луг»?

Усяго толькі ў некалькіх дзесятках кіламетраў на поўдзень ад Брусэля знаходзіцца знаёмая па падручніках мясціна — Ватэрлоо, дзе 15 ліпеня 1815 года пасля вяртання Напалеона адбылася вядомая бітва, якую французы прайгралі, пасля чаго пачалося вызваленне бельгійцаў. Бясслаўны закат напалеонаўскай эры. З розных бакоў наваколля Брусэля відаць скульптуру Льва, які сімвалізуе перамогу Англіі, Бельгіі і Нідэрландаў над вялікім імператарам. Магутны курган насыпалі ўласнымі рукамі жанчыны горада Льежа на тым месцы, дзе быў паранены прынц д'Аранж, які мужна адбіваў атакі французскіх гвардзейцаў. Высіцца фігура льва на 6-метровым масіўным пастаменце, сама статуя, адлітая з чыгуна, мае ў даўжыню 4,5 м, у вышыню — 4,45 м, а важыць 28 тон. Даволі ўражлівы малюначак яшчэ здалёк, а таму, хто захоча паглядзець на ваколіцы з вышыні льва, трэба будзе пераадолець 228 прыступак.

У брусельскай лаўцы гільдыі мяснікоў Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс напісалі свой вядомы "Маніфест Камуністычнай партыі", які так напалохаў і так спакусіў усю Еўропу і ўвесь свет прывідам "зямнога раю камунізму".

Мы расстаемся з Брусэлем. Пакідаем у цэнтры горада «Пісаючага хлопчыка» — сімвал горада. Па адной версіі, гэты хлопчык заблудзіўся і не стрымаўся (такім яго і знайшоў бацька ў натоўпе), а па другой — выбегшы за гарадскія сцены пасля шматдзённай асады, хлопчык гэтак загасіў бікфордаў шнур, калі ўжо агеньчык прабіраўся да сцен, каб рвануць страшэнным выбухам, — так нецярплівы карапуз выратаваў сталіцу ад разбурэння. Сёння ў брусельскага юнага «дэндзі» — самая багацейшая і найцікавейшая ў свеце калекцыя адзення, якая складае багаты «гардэроб джэнтльмена». Кожная фірма лічыць за гонар «апрануць» вядомага сына горада Брусэля.

Мы едзем далей у пошуках «зямнога раю»...

# Берлін: час пасля разбурэння сцяны

Мы прыехалі ў Берлін амаль дзень у дзень (12 жніўня), калі 40 гадоў таму была ўзведзена сцяна — за адну ноч і дзень. Літаральна на вачах здзіўленых немцаў, падзяліўшы вуліцы, станцыі метро, прыпынкі трамваяў, тралейбусаў і аўтобусаў, сем'і, сваякоў, знаёмых, калег па службе. «Жалезная заслона» ў прамым і пераносным сэнсе абрынулася на горад, на краіну. Тэатр жыцця бачыў і такое. А ну, праклятыя капіталісты, пасуньцеся, няма чаго на нас вылупліваць вочы!..

Затое аб'яднанне адбывалася вокамгненна. Калі ўжо ў нас ва ўсю грымела «перабудова», заходнія калегі скардзіліся нам, выкладчыкам і студэнтам філалагічнага факультэта БДУ, што прыехалі на практыку ў Йенскі універсітэт: «А ў нас нічога не адбываецца».

Адбылося. І даволі хутка. Прывезлі з ФРГ кіраўнікоў, наладзілі для выкладчыкаў рускай мовы літаральна бліц-экзамен, папрасіўшы іх расказаць пра сябе. Адных пакінулі па кантракце, астатніх — далоў, усім заўвага: «Вы не славісты. Вы — русісты. З усіх славянскіх моў вы ведаеце толькі рускую... Мала...»

Нямецкія славісты цугам пацягнуліся ў Беларусь — вывучаць беларускую мову. У БДУ працавала Міжнародная школа беларускай мовы, літаратуры і культуры, а потым яе не стала. «Зарэзалі» курыцу, якая несла залатыя яйкі. Куды цяпер падацца немцу? Вось ён бывае які, «зямны рай»... для сваіх жа. Адна мая каляжанка, выйшаўшы замуж у Германію, казала: «І паветра тут такое ж празрыстае, і цукар вельмі салодкі, трава — зялёная, але раніцай устанеш, падыйдзеш да акна, глянеш, а ў горадзе — немцы».

Берлін уразіў чысцінёй і парадкам, хоць заходняя частка яшчэ дасюль адрозніваецца ў лепшы бок ад усходняй.

— Як вам жывецца пасля аб'яднання? — пытаюся ў нямецкага калегі, спецыяліста, педагога вышэйшай школы.

Той, добра падумаўшы і ўзважыўшы ўсё, спакойна адказаў:

— Дыхаецца лягчэй.

*Уладзімір НАВУМОВІЧ, дацэнт БДУ, пісьменнік*

*(Працяг будзе.)*

## Вольга БАЗЫЛЁВА

***

Недагаворана
І недачута.
Неперагорнута,
Толькі таму што
Ты падарыў мне
Букет незабудак,
Моўчкі прамовіўшы:
"Не забывай!"
Сёння надвор'е
Прызнанняў асенніх.
Гэта гублянне
Лістотных імгненняў,
Гэта калючыя
Поціскі дрэваў,
Гэта залеваў
Нямая вада.
Ссохлі ўспамінаў маіх
Незабудкі.
Чэрствы пялёстак
У словы закуты...
Хочацца дагаварыць
І даслухаць,
Восень з чысцюткай старонкі
Пачаць...

***

Чакаючы
На той міг,
Калі пакрыўленыя
Стосы кніг
Ператворацца ў руіны,
Перапісваю ў нататнік
Гадзіны
І гляджу на неба
Са старой павуціны.
А восем паверхаў
Ніжэй
Агні
Губляюцца
Ў горадзе цемры.
І дарэмна
Гучыць твае "як прыгожа".
Сёння ты
З тых шэрых
Прахожых,
Якіх заўважаюць
З прычыны
Згубленага недзе
Гадзінніка
І пытаюцца:
"Колькі часу?"

***

Гэта проста царуе
Непагадзь.
Гэта толькі
Мурзатае сонца
Ходзіць па небасхіле
З вар'ятнаю хуткасцю.
Гэта ўжо каруселіць
Лістота,
Засмучаная
Незнаёмкаю-восенню
Ў тумановай вуалі.
Гэта непагадзь,
Якой не чакалі
Мы,
Але спяшаемся з сонцам
І ў каруселях
Лістоты
Кружым.
Гэта восень,
Якую нам не адужаць...

***

І ўспомняцца
Цень кляновы
Й пасохлай лістоты
Стос,
І скінутыя на падлогу
Сукенкі шпалерных бяроз;
У скуры схаваны
Месяц
Сцюдзёным крывым лязом,
І раны
З радкоў пакрэсленых,
І раны
З забытых радкоў.
І ўспомніцца неба
Падлогай,
Стаптанай да брудных хмар.
Усё, што стала
Далёкім,
Успомніцца як адчай...

***

Мая сцюдзёная зорка
Схаваная
Ў спелай траве.
Мае выпадковыя словы
Збяруцца
Ў адзін канверт,
І ён, як лісток асенні,
Зляціць
Да цябе ў акно.
І будзе незразумелым
Усё, што нашым было.
Спакойна ты ступіш
На зорку,
Схаваную
Ў спелай траве.
Наш свет — палынова-горкі,
Ды гэта ўсё роўна
Наш свет...



*Крыстофер Навіцкі. Lies of time. 1996.*

## Кацярына ДЗЯМЕНЦЬЕВА

***

Блекнут краски,
Картины теряют контраст.
Чьи-то глазки
Алчно смотрят на нас.
Плачут тени,
Сливаясь в одно пятно.
Просто всеми
Затоптано наше кино.
Блики ярче —
Слышится чей-то крик.
Всем — прекрасно,
А ты еще не привык.
Скоро скажешь:
«Нормально, я был не прав!»
И яркость смажешь,
Внезапно ускорив шаг.
И все в порядке:
Нам светит размытое солнце.
Играем в прятки,
Но спрятаться не удается.
Прозрачны души,
И совесть теперь чиста.
Моря все сушей
Стали еще вчера.
Размыты краски,
И тени уходят куда-то.
А чьи-то руки
Уже смывают закаты.

***

Ты смотришь, как я иду,
Ты легкость шагов замечаешь.
Я словно по морю плыву,
Вот только куда — ты не знаешь.
Тебя ни о чем не прошу,
И до тебя не дотронусь.
Я, как мираж, пройду,
И тебе миражом запомнюсь.

***

Падали капли дождя,
Лужи ловили тени.
Я искала себя,
Вмиг забытая всеми.
Искала среди тоски,
Искала среди безмолвья.
Залезла в чужие мечты,
Притаившись у изголовья.
Искала себя наяву,
Ворвавшись в душу к судьбе.
И вдруг поняла: найду
Себя я только в Тебе.

***

Я стираю руками в памяти
Все те образы, что были дороги.
И становится грустно, знаете,
И становится даже холодно.
Сердце рвется на волю птицею,
Надоело в печали маяться.
И листаются жизни страницы,
И уже по-другому мечтается.
...Я стираю из памяти образы,
Но один со мною останется:
Твои руки, глаза твои сонные...
Мне от этого не избавиться.

### НОСТАЛЬГИЯ

Слышна мелодия, забытая давно,
И исчезают образы чужие.
Проходит жизнь, как старое кино,
И к нам приходит в гости ностальгия.
Она красива и всегда грустна,
Печали каплю в сердце добавляет.
В один прекрасный день мы понимаем,
Что у двери стоит Она. Она!
И убежать не в силах, это ясно,
Мы вспоминаем тех, кого любили...
Взгрустнем. И нам покажется прекрасной
Нежданная подруга Ностальгия...

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Ум. друк. арк. 1
Падпісана да друку ў 12.00

27 верасня
Зак. 557
Т. 1000 экз.

Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45.

Рэдактар Т.М. КАЗАК

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Камп'ютэрная вёрстка Андрэя Мікулевіча, Юрыя Жукава